РЭЗАЛЮЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ
да Канферэнцыі «Новая Беларусь» 2026

АБ КОМПЛЕКСНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ПЕРАХОДУ І ПУБЛІЧНЫМ АБМЕРКАВАННІ ПРАЕКТАЎ РЭФОРМАЎ

8–9 жніўня, Варшава

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы дэмакратычных сіл Беларусі,

кіруючыся артыкулам 3 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які замацоўвае, што народ з'яўляецца адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту;

канстатуючы, што ў 2020–2026 гадах падрыхтоўка дэмакратычнага пераходу набыла сістэмны характар і ахоплівае распрацоўку стратэгій і сцэнарыяў пераходнага перыяду, праектаў Канстытуцыі і законаў, галіновых канцэпцый і дзяржаўных палітык, механізмаў узаемадзеяння палітычных, грамадскіх і экспертных структур, а таксама развіццё кадравага патэнцыялу для будучага дзяржаўнага кіравання;

прымаючы да ўвагі, што значная частка падрыхтаваных стратэгій, канцэпцый, праектаў законаў і іншых рашэнняў мае статус праектаў і працоўных версій і таму патрабуе публічнага абмеркавання, прафесійнай ацэнкі і наступнага зацвярджэння дэмакратычным шляхам;

улічваючы, што абмежаванасць часу для прыняцця рашэнняў у перыяд палітычных перамен стварае рызыкі прававой і ўпраўленчай нявызначанасці, парушэння працы дзяржаўных інстытутаў і доступу людзей да асноўных паслуг;

Прымаем гэтую рэзалюцыю:

1. Пацвярджаем, што комплексная падрыхтоўка дэмакратычнага пераходу ўключае распрацоўку стратэгіі пераходнага перыяду, падрыхтоўку рэформаў і неабходных прававых рашэнняў, забеспячэнне інстытуцыйнай гатоўнасці, а таксама развіццё кадравага патэнцыялу для дзяржаўнага кіравання і мясцовага самакіравання. Гэта з'яўляецца адной з прыярытэтных задач беларускіх дэмакратычных інстытутаў, палітычных сіл, грамадзянскай супольнасці і экспертнай супольнасці.
2. Падкрэсліваем, што падрыхтаваныя да пераходу дакументы маюць праектны характар. Яны не могуць падмяняць свабодны выбар грамадзян, адкрытую палітычную канкурэнцыю і рашэнні органаў, сфармаваных дэмакратычным шляхам.
3. Вызначаем у якасці асновы падрыхтоўкі рэформаў незалежнасць і суверэнітэт Беларусі, годнасць чалавека, дэмакратыю, вяршэнства права, падсправаздачнасць улады і павагу да беларускай ідэнтычнасці. Канкрэтныя інстытуцыйныя, эканамічныя і сацыяльныя мадэлі павінны вызначацца шляхам адкрытага абмеркавання і прымянення дэмакратычных працэдур.

4. Лічым неабходным сістэматызаваць дакументы, якія складаюць «пазітыўную альтэрнатыву» і забяспечваюць падрыхтоўку дэмакратычнага пераходу, ацаніць ступень іх гатоўнасці і стварыць публічны рэестр. Рэестр павінен ахопліваць стратэгічныя дакументы, праекты Канстытуцыі і законаў, канцэпцыі рэформаў і дзяржаўных палітык, планы інстытуцыйных пераўтварэнняў і іншыя праектныя рашэнні. Яны павінны праходзіць грамадскае абмеркаванне і, пры неабходнасці, палітычнае ўзгадненне, а выяўленыя прабелы павінны запаўняцца рашэннямі, неабходнымі для цэласнай падрыхтоўкі дэмакратычнага пераходу. Абмежаванні доступу да інфармацыі дапускаюцца толькі з меркаванняў бяспекі.

УСТАНАЎЛІВАЕМ НАСТУПНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФОРМАЎ

- рэформы павінны праводзіцца з безумоўнай павагай да правоў і свабод чалавека;
- асноўныя рашэнні аб дзяржаўным ладзе і напрамках развіцця Беларусі павінны прымацца пры прадстаўнічым удзеле беларусаў і зацвярджацца праз дэмакратычныя працэдуры;
- праекты рэформаў павінны праходзіць адкрытае грамадскае абмеркаванне з магчымасцю бяспечнага ўдзелу беларусаў у краіне і за мяжой;
- у пераходны перыяд неабходна забяспечыць прававую пэўнасць, працу дзяржаўных інстытутаў і доступ людзей да асноўных паслуг;
- падрыхтоўка пераходу павінна ўключаць стварэнне арганізацыйных і кадравых умоў для практычнай рэалізацыі рэформаў, бесперапыннай працы дзяржаўнага кіравання і мясцовага самакіравання;
- адказнасць за парушэнні павінна мець індывідуальны характар, грунтавацца на належнай прававой працэдуры і справядлівым судовым разглядзе, прадугледжваць аднаўленне правоў пацярпелых і выключаць калектыўную адказнасць і пазасудовы пераслед;
- абгрунтаванасць рашэнняў доказамі і прафесійнай экспертызай, ацэнка іх наступстваў, абарона ўразлівых груп і публічная справаздачнасць адказных інстытутаў.

ЗАКЛІКАЕМ КААРДЫНАЦЫЙНУЮ РАДУ І ФРАКЦЫІ КР У МЕЖАХ ІХ МАНДАТА ПРЫНЯЦЬ АСОБНАЕ РАШЭННЕ, ЯКІМ:

- арганізаваць публічнае абмеркаванне і міжінстытуцыйнае палітычнае ўзгадненне праектаў, якія складаюць «пазітыўную альтэрнатыву» і бачанне Новай Беларусі;
- на працягу трох месяцаў у кааперацыі з ОСЦ, АПК, стварыць публічны рэестр дакументаў і зацвердзіць празрыстую працэдуру ўнясення, экспертнай ацэнкі, публікацыі, грамадскага абмеркавання, разгляду папраўак, палітычнага ўзгаднення і перагляду праектаў.
- садзейнічаць выпрацоўцы ўзгодненай стратэгіі развіцця кадравага патэнцыялу для дзяржаўнага кіравання і мясцовага самакіравання, уключаючы вызначэнне патрэбных кампетэнцый, фармаванне кадравага рэзерву, развіццё сістэм адбору, навучання і практычнай падрыхтоўкі;

- садзейнічаць узгадненню стратэгіі пераходнага перыяду, праектаў рэформаў і кадравай падрыхтоўкі паміж беларускімі дэмакратычнымі інстытутамі, палітычнымі сіламі, грамадзянскай супольнасцю і экспертнай супольнасцю.

ЗАКЛІКАЕМ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ, ГРАМАДЗЯНСКУЮ СУПОЛЬНАСЦЬ, ЭКСПЕРТНЫЯ ЦЭНТРЫ І НЕЗАЛЕЖНЫЯ МЕДЫЯ

- удзельнічаць у распрацоўцы і крытычнай ацэнцы стратэгій пераходнага перыяду, праектаў рэформаў і дзяржаўных палітык, адкрыта прадстаўляць альтэрнатыўныя прапановы і садзейнічаць падрыхтоўцы спецыялістаў для іх практычнай рэалізацыі;
- забяспечваць удзел пацярпелых ад рэпрэсій, прафесійных супольнасцей, работнікаў дзяржаўнага і прыватнага сектараў, мясцовых супольнасцей у абмеркаванні рашэнняў, якія непасрэдна закранаюць іх правы і ўмовы жыцця;
- прадстаўляць грамадству дакладную і даступную інфармацыю пра мэты, варыянты, перавагі, рызыкі і магчымыя выдаткі рэформаў, пазбягаючы як запалохвання, так і неабгрунтаваных абяцанняў.

ЗАКЛІКАЕМ ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ І ІНШЫХ МІЖНАРОДНЫХ ПАРТНЁРАЎ

- забяспечваць доўгатэрміновую і прадказальную падтрымку незалежнага беларускага экспертнага асяроддзя, грамадзянскай супольнасці, медыя, адукацыйных ініцыятыў, чыя дзейнасць скіравана на падрыхтоўку і прасоўванне пазітыўнай альтэрнатывы, а таксама праграм развіцця кадравага патэнцыялу і дэмакратычных інстытутаў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы пераходнага перыяду;
- аказваць тэхнічную, экспертную і адукацыйную падтрымку для распрацоўкі стратэгіі пераходнага перыяду, падрыхтоўкі і ацэнкі рэформаў, развіцця інстытуцыйнай і кадравай гатоўнасці, а таксама загадзя распрацоўваць механізмы хуткай дапамогі Беларусі пасля пачатку дэмакратычнага пераходу.

Стратэгічная, прававая, інстытуцыйная і кадравая падрыхтоўка дэмакратычнага пераходу павінна ажыццяўляцца загадзя. Разам з тым падрыхтаваныя праекты і прапанаваныя мадэлі не могуць падмяняць волю беларускага народа, а асноўныя рашэнні аб будучым дзяржаўным ладзе, змесце рэформаў і напрамках развіцця Беларусі павінны прымацца праз адкрытае грамадскае абмеркаванне, свабодныя выбары і дэмакратычна сфармаваныя інстытуты.

Офіс Святланы Ціханоўскай,
Аб'яднаны Пераходны Кабінет,
Каардынацыйная Рада,
Платформа палітычных партый